ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 202 (1169) | ПАНЯДЗЕЛАК, 1-га верасьня 1930 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

# Правярыць гатоўнасьць да новага навучальнага году

*ЦК УсеЛКСМБ абавязвае ўсе свае мясцовыя арганізацыі пасіліць работу па комплектаваньню пэдагогічных ВНУ і школ кадрамі, на аснове раней даных дырэктыў*

МАСКВА, 30. Над усеагульным пачатковым навучаньнем Ленінскім комсамолам узята шэфства.

ЦК УсеЛКСМ, прызнаючы тэмпы падрыхтоўкі ўсеагульнага навучаньня зусім недастатковымі, паслаў усім райкомам УсеЛКСМ радыёграму з указаньнем, каб комсамольцы на мясцох неадкладна праверылі гатоўнасьць да новага навучальнага году, аддаўшы асаблівую ўвагу пытаньням забясьпечаньня дзяцей батракоў і беднякоў вопраткай, абуткам і харчаваньнем, а таксама і падручнікамі.

ЦК Усе ЛКСМ абавязвае ўсе свае мясцовыя арганізацыі пасіліць работу па комплектаваньню пэдагогічных ВНУ і школ кадрамі, на аснове раней даных дырэктыў.

Сумесна з рэспубліканскім камітэтам садзейнічаньня ўсеагульнаму навучаньню ў РСФСР на месцы высылаюцца комсамольскія брыгады.

# З комсамольскай заўзятасьцю за ліквідацыю прарываў

**Пляны сілосаваньня па Беларусі зрываюцца.** Так значыцца ў поште-тэлеграме ЦК ЛКСМБ райкомам комсамолу.

Ня гледзячы на тое, што справа сілосаваньня адыгрывае вялізарную ролю ў вырашэньні жывёлагадоўчай проблемы, да гэтага часу на гэтым фронце ня толькі няма баявых бальшавіцкіх тэмпаў, але нават і ў шэрагу месц безадказныя, наплявацельскія адносіны, якія нельга інакш назваць, як „фактычная недаацэнка важнасьці сілосаваньня". (З пастановы ЦК КП(б)Б).

Сігналы газэт і ў прыватнасьці „Чырвонай Зьмены" аб рэальнай пагрозе зрыву сілосаваньня, аб прарывах на гэтым фронце, аб тым, што шэраг колгассаюзаў райвыканкомаў у гэтым пытаньні бяздзейнічаюць, што профорганізацыі стаяць у баку ад гэтай важнейшай справы, што комсамольскія чынушы тыпу Віцебскіх райкомаўцаў **лічаць ніжэй свайго гонару займацца сілосаваньнем, што шэраг партыйных камітэтаў ня кіруе работай па сілосаваньню, ня далі дзейных вынікаў...**

У даным выпадку вельмі характэрным зьяўляецца выпадак з Калінкавіцкім райкомам КП(б)Б, які з мэтай прыкрыцьця сваёй бяздзейнасьці вынес пастанову, якая асуджала дзейнасьць РК ЛКСМБ і ў прыватнасьці сэкратара за тое, што „Л. К." папрасіла ў райкоме пастанову... аб сілосаваньні, для таго, каб праверыць, як яна выконваецца адпаведнымі організацыямі.

**Аказалася, што такой пастановы ў райкоме КП(б)Б няма.**

Тэмпы работы па ўсіх напрамках і асабліва з боку комсамольскіх організацый, якія узялі на сябе абавязкі перад Наркамземам—**зьяўляюцца недапушчальна маруднымі.**

Спасылаючыся на об'ектыўныя прычыны, у шэрагу месц колгасы і саўгасы, атрымаўшы гатовыя часткі стандартных сілосных башт, трымаюць іх у бяздзейнасьці.

**Плян выпуску сілосарэзак па Гомсельмашу выканан усяго на 50 проц.**

Ня малая колькасьць райкомаў ЛКСМБ яшчэ і да гэтага часу займаецца складаньнем рэзолюцый і пісаньнем плянаў.

**„Пальма пяршынства" у дадзеным выпадку належыць Высачанскаму райкому КСМ, які на запытаньне ЦК ЛКСМБ аб колькасьці выкапаных ям адказаў бюрократычнай адпіскай аб тым, што былі скліканы нарады, выпрацаваны пляны, а колькі ям—няма вучоту.**

Гэты факт бюрократычных казённых адносін комсамольскіх чынуш да гэтай важнейшай справы заслугоўвае ўвагі таму, што ён не адзіны.

**Апошнія зьвесткі сыгналізуюць, што ў пагоне за колькасьцю, зусім не зьвяртаецца ўвага на якасьць як ям, так і сілоснага матар'ялу, з прычыны чаго магчыма гніеньне сілосу, а значыць компромэтацыя важнейшай ідэі—сілосаваньня.**

**На сёньня засілосавана толькі... 1,1 проц.**

Такое становішча працягвацца далей ня можа.

Райкомы, ячэйкі комсамолу павінны ўрэшце зразумець увесь політычна-гаспадарчы сэнс справы сілосаваньня, ўсю вялічыню адказнасьці, якая ўскладаецца партыяй па комсамол.

**Пастанова ЦК КП(б)Б, тэлеграма ЦК ЛКСМБ абавязваюць комсамольскія організацыі выканаць «баявую задачу вялізнай політычнай важнасьці—засілосаваць адзін мільён тон сілосу".**

Патрэбна зараз-жа разгарнуць растлумачальную кампанію аб політычна-гаспадарчым значэньні сілосаваньня праз шырокае правядзеньне адчыненых сходаў комсамольскіх ячэек, сходаў колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкай моладзі.

**Трэба дабіцца, каб справа сілосаваньня набыла найбольш масавы характар, каб па прыкладу колгасу, саўгасу, комсамольскіх ячэек—адзінаасобнікі колектыўным парадкам сілосавалі кармы.**

Комсамольскія ячэйкі павінны быць застрэльшчыкамі стварэньня адзінаасобнікамі колектыўных сілосных ям.

**Мы прапануем правесьці другі Усебеларускі налёт „Лёгкай Кавалерыі" на колгасы, саўгасы, райвыканкомы, колгасімалжывёлсаюзы, КСУ, профэсыянальныя і коопэрацыйныя організацыі з мэтай праверкі, што яны робяць у галіне сілосаваньня. Райкомы КСМ, комсамольскія ячэйкі павінны організаваць узаемную праверку сваёй дзейнасьці ў галіне ажыцьцяўленьня партыйных задач па сілосаваньню.**

Усю работу па сілосаваньню неабходна правізаць мэтадамі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Самым рашучым чынам змагацца з панікёрствам, з недаацэнкай важнасьці сілосаваньня, як з разнавіднасьцю правага опортунізму.

**Толькі пры ўмове правядзеньня ў баявым ударным парадку ўсіх гэтых мерапрыемстваў—мы зможам асіліць лічбу—1.000.000—выканаць плян сілосаваньня.**

Польшча

# Аграрная конфэрэнцыя—антысавецкіх выпадаў

## Першыя крокі „дзейнасьці" распаясаўшагася прэм'ера—Пілсудзкага

ВАРШАВА, 30. На конфэрэнцыі аграрных краін у Варшаве дэлегаты, усе бяз выключэньня, падкрэсьлівалі грандыёзныя памеры разгортваючагася ў Эўропе гаспадарчага крызісу.

Як на адну з асноўных прычын аграрнага крызісу дэлегаты ўказваюць на протэкцыянізм у індустрыяльных краінах. Большасьць прамоўцаў нападала на ПАЗШ. Толькі прадстаўнік Вэнгрыі імкнуўся зваліць віну за эўропэйскі аграрны крызіс на СССР.

Румынскі дэлегат Маджэару высунуў проэкт агульна-эўропэйскага мытнага саюзу сваім вастрыём накіраванага супроць СССР. Прадстаўнікі зьехаўшыхся ў Варшаву аграрных дзяржаў самі ведаюць нескладанасьць конфэрэнцыі.

У політычных колах Варшавы, конфэрэнцыі не прыдаюць ніякага значэньня з пунку погляду дасягненьня якіх-небудзь эканамічных вынікаў. Указваецца толькі, што конфэрэнцыя бязумоўна зьяўляецца дыплёматычным посьпехам Польшчы.

Карыстаючыся конфэрэнцыяй, польская дыплёматыя зможа правесьці шэраг перагавораў па пытаньнях, якія ня маюць адносін да програмы работ конфэрэнцыі.

Сёньня некаторыя дэлегаты запрошаны Пілсудзкім на шклянку гарбаты.

ВАРШАВА, 30. Мяркуюць, што Варшаўская конфэрэнцыя закончыць сваю работу яшчэ сёньня. Пасьля зачыненьня конфэрэнцыі дэлегаты зробяць падарожжа па Польшчы.

### Варшаўская „корэктура"

По словах Пілсудзкага, констытуцыя Польшчы ператвараецца ў вулічную дзеўку.

(З газэт).

# Польскі сойм распушчан

ВАРШАВА, 30. Прэзыдэнт рэспублікі падпісаў дэкрэт аб роспуску сойму і сэнату. Выбары ў сойм назначаны на 16-га лістапада, а выбары ў сэнат 28-га лістапада 1930 г.

# Зьбіты лідэр сялянскай партыі—Домбскі

ВАРШАВА, 30. На віцэ-старшыню сойму, лідэра сялянскай партыі—Домбскага зрабілі напад некалькі офіцэраў.

Домбскі зьбіты каля парогу сваёй кватэры. Адначасова зроблен напад на нацыянал-дэмократычнага дэпутата Верчака.

Ліст з Польшчы

# Пілсудзкі на чале фашысцкай дыктатуры

Замена Славэка „рассыльнага", як ён сам сябе называў, маршалам Пілсудзкім застала ўроспалах опозыцыйныя партыі. Друк эндэкаў, кулацкіх партый „Вызваленьне" і „Пяст" і соцыял-фашысцкай ППС зусім разгубіўся.

Ён сьвядома маўчыць аб сапраўдным значэньні прыняцьця ўлады Пілсудзкім і толькі гаворыць аб „нечаканасьці" гэтага здарэньня.

Нельга было опозыцыі ясьней выкрыць сваё бясьсільле. Ня толькі на справе, але і на словах яна баіцца выступіць супроць таго, хто служыць найбольш яркім адлюстраваньнем фашысцкай дыктатуры. Нават не спрабуючы змагацца, опозыцыя загадзя прызнала сябе пераможанай. Гэта і зразумела. Па нядаўнаму вопыту опозыцыйныя партыі ведаюць, што парляманцкай барацьбою Пілсудзкага ня возьмеш. Маршал, як вядома на палахлівыя прамовы опозыцыйных дэпутатаў у сойме прывыклі адказваць ударамі кулака па сталу і іншымі моцнымі „непарляманцкімі" способамі.

Ні адзін з шляхоў, якія ляжаць перад опозыцыяй, не прывядуць яе да жаданай мэты—адхіленьня Пілсудзкага. Пачнеш парляманцкую „барацьбу"—Пілсудзкі распусьціць сойм, зьменіць выбарчы закон, закончыць і формальна фашызацыю краіны.

Пазапарляманцкая барацьба—тагогалядзі—разьвяжа сапраўдныя рэволюцыйныя сілы, якія зьмятуць разам з Пілсудзкім і ўсю бяззубую „опозыцыю". Панове эндэкі, вызваленцы, пястоўцы і пэпэсаўцы баяцца, зразумела, рэволюцыі больш, чым пана Пілсудзкага.

Не аб барацьбе думае зараз опозыцыя, а ўсяго толькі аб тым, каб „выратаваць твар", ня надта яўна і адкрыта ідучы на прымірэньне з новымі абставінамі. Менавіта гэтага дабіваецца Пілсудзкі.

Ва ўмовах эканамічнага, соцыяльнага і міжнароднага крызісу, які перажывае зараз Польшча, Пілсудзкаму важна адно, каб ня блыталася ў нагах опозыцыя і сваім мізэрным ляманам аб аслабленьні „дэмократыі" не перашкаджала яму „ратаваць" абшарніцкую і капіталістычную Польшчу.

Ня трэба быць прарокам, каб бачыць, куды завядзе Польшчу дыктатура Пілсудзкага. Калі можна прыкрыкнуць на „опозыцыю", дык нельга ўжыць той-жа мэтад да перамогі эканамічнага крызісу, узрастаючага рэволюцыйнага настрою рабочых і сялянскіх мас і знадворна-політычных цяжкасьцяй.

Не ва ўладзе Пілсудзкага аздаравіць гаспадарчае жыцьцё краіны. Паданьне здабычы вугалю (з 24.436 тысяч тон у другім паўгодзьдзі 1929 г. да 17.514 тысяч тон у першым паўгодзьдзі бягучага году), вытворчасьці чугуна (з 345.400 тысяч да 253.200) і сталі (з 627.400 да 608.400), скарачэньне замежнага гандлю (па вывазу—з 1.589 міл. злотых за другую палову 1929 г. да 1.217 міл. у першым паўгодзьдзі бягучага году, па ўвозу з 1.453 млн. да 1.136), крайняе абвастраньне аграрнага крызісу, непазбежны дэфіцыт па дзяржаўнаму бюджэту,—усё гэта хваробы, якія не паддаюцца лячэньню мэтадамі агалцелага фашызму.

На глебе эканамічнага крызісу бязупынна расьце рэволюцыйны рух рабочых і сялянскіх мас. Адзіным адказам Пілсудзкага на іх патрабаваньні будзе жорсткі тэрор. Ён прывядзе не да „заспакаеньня", а да далейшага абвастраньня клясавай барацьбы, да новага росту ўплыву польскай компартыі.

Польскія фашысты прымушаны шукаць выйсьця з унутраных цяжкасьцяй у надворных авантурах. Аб гэтым сьведчыць скліканая ў Варшаве 28-га жніўня „аграрная" конфэрэнцыя прыдунайскіх і прыбалтыцкіх краін. Польская буржуазія пад кіраўніцтвам Пілсудзкага ставіць стаўку на „абарону" польскай гаспадаркі ад нямецкага і савецкага імпорту і на „выратаваньне" буржуазнай Польшчы шляхам канчатковага падпарадкаваньня польскай замежнай політыкі антысавецкім плянам фактычнага гаспадара Польшчы—францускага імпэрыялізму.

Жорсткае прыгнечаньне рабочых і сялян, поўнае падпарадкаваньне францускаму капіталу, фантастычныя пляны „падзелу" СССР—такая няскладаная фашысцкая програма „ратаваньня Польшчы".

Недалёкая будучыня пакажа, да што абыйдзецца Польшчы яе „ратаваньне" доморошчанымі фашыстымі і іх распаясаўшымся „комэндантам".

Швэйцарыя

# II зьезд рабочай моладзі

БЭРЛІН, 29. З Базэлю паведамляюць, што там адбыўся другі зьезд рабочай моладзі Швэйцарыі.

Зьезд склікан па ініцыятыве швэйцарскага комсамолу.

КІТАЙ

# Чанша абкружан з усіх бакоў чырвонымі часьцямі

## Атрады чырвоных занялі горад Лілін

**ЛЁНДАН, 30. Чырвоная армія, колькасьцю ў 20000 чалавек, наступае ў кірунку Чанша. Чужаземцы рыхтуюць эвакуацыю гораду на канонэрках.**

**ШАНХАЙ, 30. Барацьба за Чанша разгараецца з новай сілай.**

**Чырвоныя войскі занялі горад Лілін (у 30-ці кілёметрах ад Чанша) і пагражаюць Чанша. Пінцзян пакінула ўрадавае войска.**

**Такім чынам, Чанша акружан з усіх бакоў чырвонымі часьцямі.**

**Каля Чанша згуртоўваюцца буйныя ваенныя сілы Нанкінскага ўраду.**

**Войска камандуючага ваеннымі сіламі провінцыі Хунань аказвае моцнае супраціўленьне чырвоным.**

**Аднак, сілы нанкінцаў занадта абмежаваны і ў некаторых мясцох перадавыя лініі абароны надта слабыя.**

**Японскае агенцтва заяўляе, што 2000 арміі будзе надта цяжка абараніць Чанша ад наступаючай 20-тысячнай Чырвонай арміі.**

# НЕПРЫМІРЫМА ЗМАГАЦЦА З ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫМ ШОВІНІЗМАМ!

## ЯРЫЯ РУСАЦЯПЫ КЛЮЧНІК І СІРОТКІН, ЗМАГАЮЧЫСЯ З БЕЛАРУСІЗАЦЫЯЙ, ЦКАВАЛІ І ЗВОЛЬНІЛІ З ПРАЦЫ НАСТАЎНІКА ГОМЕЛЬСКАЙ ШКОЛЫ ФЗВ, ГРАМАДЗКАГА ПРАЦАЎНІКА, ТАВ. КАВАЛЁНКУ

### Агентам клясавага ворага—заўзятым русацяпам ня месца ў савецкай школе

**Упартым і пасьлядоўным ажыцьцяўленьнем беларусізацыі нанясем руйнуючы ўдар па галоўнай небясьпецы ў адхіленьні ад ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі—вялікадзяржаўным шавінізьме, дамо рашучы адпор контр-рэволюцыйнаму беларускаму нацыянал-дэмократызму**

У Гомельскай школе ФЗВ чыгуначнікаў пры заводзе імя Ланцуцкага ізноў усё ціха. Ізноў па старому, ня гледзячы на протэсты новых фабзайцаў, усе прадметы выкладаюцца па-расійску, ізноў сьвяткуе перамогу вялікадзяржаўны шовінізм, які пусьціў свае моцныя карэньні ў школе.

Усё ціха, бо адданы працаўнік,—выкладчык белмовы тав. **Кавалёнак**,—зьняты з працы. Ізноў ціха, бо ярыя русацяпы тыпу загадчыка школы **Ключніка**, загадчыка навучальнай часткі **Сіроткіна** сьвяткуюць перамогу.

Зьмяшчаемы ніжэй артыкул тав. **Віт. Сідарука** апавядае аб ганебным факце барацьбы з беларусізацыяй,—цкаваньні аднаго працаўніка выкладчыка белмовы тав. **Каваленка**, у ФЗВ чыгуначнікаў. Ен сьведчыць яшчэ і аб тым, што людзі, якім не падабаецца ленінская нацыянальная політыка партыі, прымаюць усе захады, каб цкаваньнем і звальненьнем з працы пазбавіцца актыўнага барацьбіта на фронце беларусізацыі.

Гэты матар'ял гаворыць аб многім. Ён павінен зьявіцца сыгналам, што на фронце беларусізацыі небясьпечна, што людзі забыліся аб тым, што ўсякія скажэньні ў ленінскай лініі партыі атрымаюць рашучы адпор ад нашай пролетарскай грамадзкасьці.

Зараз, перад пачаткам навучальнага году, гэты факт заслугоўвае асаблівае ўвагі. У той час, калі нашым навучальным установам не хапае пэдкадраў, некаторыя кіраўнікі са шкодніцкай нядбайнасьцю адносяцца да справы скарыстаньня існуючых кадраў.

Адпаведныя партыйныя і асьветныя органы Гомельшчыны павінны заняцца высьвятленьнем гэтай справы з прыцягненьнем вінаватых да адказнасьці.

Партыйныя і комсамольскія організацыі павінны разгарнуць самаправерку стану правядзеньня беларусізацыі па нашых навучальных установах з тым, каб факты з беларусізацыяй па-гомельску ў далейшым не паўтараліся.

Сыгнал з Гомелю зьяўляецца лішнім доказам своечасовасьці і правільнасьці пастановы Фрунзаўскага і Кастрычнікаўскага райкомаў КП(б)Б (Менск) аб правядзеньні месячніку самаправеркі беларусізацыі.

Партыйныя і комсамольскія організацыі павінны падхапіць пачын Фрунзаўкі.

Райкомы КСМ і ячэйкі Фрунзаўскага і Кастрычнікаўскага райкомаў павінны зараз-жа прыступіць да ажыцьцяўленьня задач месячніку. Месячнік павінен быць ператвораны у масавую самаправерку выкананьня дырэктыў партыі ў галіне ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі.

Месячнік самаправеркі зьявіцца рашучым ударам па галоўнай небясьпецы адхіленьня ад ленінскай нацыянальнай політыкі—вялікадзяржаўным шовіністычным супраціўленьні беларусізацыі з боку русацяпаў, якія дзе-ні-дзе маюць месца ў савецкім, коопэрацыйным і профэсыйным апаратах.

Упартым, пасьлядоўным ажыцьцяўленьнем беларусізацыі, як прынцыпу ленінскай нацыянальнай політыкі, нанясем руйнуючы ўдар па беларускім нацыянал-дэмократызьме.

Гомельская чыгуначная школа ФЗВ пры заводзе імя Ланцуцкага знаходзіцца ў хваравітым стане. У яе жыцьцё патрэбна ўмяшаньне грамадзкасьці і гэта павінна быць зроблена безадкладна.

Сярод значнай колькасьці вучняў ФЗВ за ўвесь час вучобы ніякай праца па беларусізацыі не праводзілася. Толькі летась пачалі патрошку беларусізаваць школу. Спачатку 1929-30 навучальнага году вучні зусім ня ўмелі ні чытаць, ні пісаць па-беларуску. Выкладаньне белмовы вялося з халадком. Гэтай справай ніхто ня цікавіўся,—вучні ня вучыліся, а толькі калечыліся.

### Праца ажыла

Увосень 1929-30 году ў школу ФЗВ быў прызначан выкладчыкам белмовы тав. Кавалёнак. Зараз-жа пасьля азнаямленьня з вучнямі і становішчам беларусізацыі ў школе, на ячэйцы ЛКСМБ, быў пастаўлен яго даклад аб беларусізацыі. Па дакладу была прынята пастанова аб неабходнасьці разгортваньня працы па вывучэньню бел. мовы комсамольцамі і ўсімі беспартыйнымі вучнямі школы.

Спачатку было вельмі цяжка праводзіць занятк. Вучні цэлымі групамі ўцякалі з клясы, або зьяўляліся ў час занятку па аднаму, па два, стаялі ў дзьверах, курылі і літаральна зрывалі вучобу.

Даклады настаўніка ня мелі рашучага ўплыву на палепшаньне справы беларусізацыі. Аднак пры яго асабістай упартасьці і належным рэагаваньні комсамольскай ячэйкі, вучкому і адпаведнай працы ўсяго актыву школы справа па вывучэньню бел. мовы відочна для ўсіх была ўзьнята на пэўную вышыню. Ужо пры выпуску старэйшых груп у студзені месяцы 1930 г. мы ня чулі „цыркулярнай белмовы, вучні свабодна выступалі з прамовамі на беларускай мове.

На першай школьнай радзе было адзначана вялікае ўздзейнічаньне тав. Кавалёнка на вывучэньне белмовы вучнямі і падкрэсьлена асабіста яго ўпартая праца ў выкладаньні свайго прадмету і ў зруху ўсяе працы па беларусізацыі школы.

На другі трыместар старэйшыя групы былі выпушчаны, а другая сьлясарная пашла ў водпуск. У школу набрана было 180 чалавек новых вучняў. Цяпер патрэбна была вялікая праца старэйшых вучняў каб заахвоціць усіх паступіўшых да сур'ёзнага вывучэньня бел. мовы. Трэ' было пераварыць гэтую масу ў школьным катле. Тым часам сіл для гэтага не аказалася. Першыя клясы, што прыняты былі ўвосень, сталі зусім нядбайна адносіцца да вывучэньня бел. мовы, вучыліся спэп. справе, фізыцы і іншым прадметам, але толькі ня гутарыць па-беларуску.

Для ажыўленьня беларусізацыі школы тав. Кавалёнак прапанаваў свае паслугі колектыву пэдагогаў. Пры школе заснаваўся настаўніцкі гурток па вывучэньню белмовы. Гэты гурток, не прапрацаваўшы курсу, разваліўся, бо начальнік школы—Ключнік, былы загадчык вучнёўскай часткай школы—Штаненка і іншыя настаўнікі пасыўна адносіліся да вывучэньня бел. мовы і зьяўляцца на заняткі палічылі лішняй і непатрэбнай справай.

Яшчэ ў студзені 1930 г школьная рада ўхваліла перавесьці выкладаньне грамадазнаўства на белмову, але загадчык школы А. Ключнік, як выкладчык грамадазнаўства, нядбайна аднёсься да пастановы школьнай рады і выкладае грамадазнаўства да сёньнешняга дня па-расейску. Гледзячы на прыклад начальніка школы, усе настаўнікі яшчэ больш актыўна сталі супраціўляцца беларусізацыі. Яны проста заявілі:—**„Па-беларуску чытаць лекцыі ня будзем, бо нават і падручнікаў па опэцыяльных прадметах на белмове няма" (?!).**

### Зрывалі вучобу

Гэта давала повад клясава-варожым і чужы пралетарыяту элемэнтам сярод вучнёўства ігнараваць прадмет і зьдзекавацца над выкладчыкам тав. **Кавалёнкам**. Былі выпадкі, калі вучні гаўкалі па-сабачаму пры спатканьні яго ў школе або на вуліцы. Ня раз штурхалі адзін аднаго на т. Кавалёнка. Некаторыя вучні перасталі зусім наведваць заняткі, або квапіліся іх зрываць.

Усё гэта праходзіла на вачох школьнай адміністрацыі, якая пра ўсё добра ведала, але сваім бяздушшам і нерэагаваньнем патурала супраціўнікам хутчэйшай беларусізацыі школы, чым павялічвала зьдзекі над выкладчыкам.

Дайшло да таго, што ў час лекцый граматыкі, каб сарваць працу, вучні ўставалі і крычалі: **„Дзе цяпер жывуць беларускія нацыянал-дэмократы?"** Усе скаргі т. Кавалёнка заставаліся голасам у пустэчы. Староста 1-й сьлясарнай групы—Іваноў і іншыя вучні гэтай-жа групы на лекцыі белмовы вялі сябе да таго дзіка і зачэпна, што выкладчык прымушан быў зьвярнуцца за дапамогай да загадчыка школы.

Выявіўшы варожыя адносіны да вывучэньня белмовы з боку некаторых вучняў, загадчык, на вялікі жаль, нічога не зрабіў, каб зьнішчыць гэтыя абураючыя зьявы ў школе і забясьпечыць нормальныя ўмовы для працы настаўніка. Паводзіны загадчыка і ў гэтым выпадку яшчэ лішні раз выявілі яго чыннасьць, накіраваную супроць беларусізацыі і дасканала характарызуюць узаемаадносіны паміж настаўнікамі школы.

Настаўнікі школы—стопроцантныя русацяпы. Яны стойка змагаюцца супроць беларусізацыі, супроць нацыянальнай політыкі партыі, супроць будаўніцтва нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьместу культуры. Такі сапраўдны вялікадзяржаўны твар настаўнікаў школы ФЗВ.

### Кавалёнак—„не актывісты"

Калі аднойчы тав. Кавалёнак давёў наяўнасьць супраціўленьня правядзеньню беларусізацыі ў школе, дык настаўніцтва паставіла яму ў віну тое, што ён, моў, ня выконвае ніякай грамадзкай нагрузкі. Але мы ведаем, што т. Кавалёнак, як актыўны корэспондэнт, удзельнічаў у працы юнкораўскага гуртка пры школе штодзённа дапамагаў яму ў працы, стварыў і кіраваў гурткамі па вывучэньню белмовы, кіраваў драмгуртком і інш. Настаўнік Кавалёнак, як корэспондэнт, меў неасьцярожнасьць закрануць у допісах у газэту „Зьвязда" аднаго члена мясцкому профасьветы. Яшчэ больш загарэўся сыр-бор.

Кавалёнка цкавалі як рабкора ў 9-й чыгуначнай школе, дзе ён працаваў па сумяшчэньню.

Нарэшце, дашло да таго што тав. Кавалёнку не далі падагуліць працу школы за 1929-30 навучальны год перад групамі. Адпусьцілі вучняў на вакацыі 30 чэрвеня школьная рада выносіць у адносінах Кавалёнка, як працаўніка, самую агідную, ні на чым не абгрунтаваную пастанову:—**„Беларусізацыя ў школе ФЗВ не праводзілася, бо выкладчык белмовы т. Кавалёнак фармальна адносіўся да навучаньня і не зьяўляўся выхавальнікам вучняў..." (?!).**

З вучняў на школьнай радзе выступілі самыя заядлыя ворагі беларусізацыі, як Астапенка, Ігнацьцеў і інш. Ад настаўнікаў з асабліва жорсткай крытыкай выступалі тыя, каму не да смаку пераход на бел. мову, хто лы... барам становіцца супроць гэтага пераходу і ніяк ня можа пагадзіцца з заменай „прыгожай" расійскай мовы на „хамскую" беларускую мову. (Штаненка, Сіроткін, Ключнік і Хайкін).

### Наступ на беларусізацыю

Заявы Кавалёнка аб тым, што ў школе няма падтрыманьня беларусізацыі, а ёсьць разьюшаны вялікадзяржаўны шовінізм і квітнее русацяпства, а таксама заўвага прысутнага на агульным сходзе супрацоўніка рэдакцыі „Чырвонай Зьмены" тав. Цішкі Вернага аб тым, што на школьным сходзе ніхто ня ўжывае беларускае мовы і што антысэмітызм звычайная зьява ў школе, — толькі раззлавалі Ключніка і настаўніцтва, якое, замест адпору вылазкам супроць беларусізацыі, ашальмавала адданага савецкай уладзе і партыі працаўніка тав. Кавалёнка.

На другі дзень раніцою, калі Кавалёнак заявіў, што ён на вынесеную школьнай радай пастанову апэлюе па лініі Акрана, Ключнік і пэдагогі пашлі на хітрасьць. Яны заявілі Кавалёнку, што ня лічаць правільнай вынесеную пастанову, што зьменяць яе і нічога дрэннага не пакажуць у адносінах да тав. Кавалёнка, бо пастанова была зроблена наскокам.

Прайшло лета і загадчык вучнёўскай часткаю школы Сіроткін заявіў тав. Кавалёнку, што „трыо" — ён, Сіроткін, Ключнік і Хайкін, — ухвалілі зьвольніць яго з пасады настаўніка, як не апраўдаўшага сябе на працы за 1929-30 г. (?!). Ні мясцком ні РК КП(б)Б не зацікавіліся сутнасьцю агіднай справы і па-бальшавіцку ня выступілі на абарону настаўніка супроць варожай нам вылазкі, кучкі русацяпаў.

Трэба адзначыць, што тав. Кавалёнак зьяўляецца адным з лепшых, палітычна-вытрыманых і моцных настаўнікаў у горадзе Гомелі. Яго ведаюць шырокія масы, як пісьменьніка і паэту. Тав. Кавалёнак напісаў п'есу для вялікай сцэны „Навея", якая здадзена для надрукаваньня ў орган БелАПП „Маладняк" і ў расійскім перакладзе —для пастаноўкі ў першым рабочым тэатры Маскоўскага Пролеткульту. Па справе цкаваньня тав. Кавалёнка ў 9-ай чыгуначнай школе Гомельскае АКК-РСІ вяла расьсьледваньне, вынесла пастанову аб наяўнасьці праў... сьледваньня яго і зрабіла належныя вывады, што і абвешчана ў акруговай газэце „Палеская Праўда" № 173, ад 27-га ліпеня, а таксама аб гэтым была дана паказаньне Сталінскаму РК КП(б)Б і гарадзкой інспэктуры нарасьветы. Але ні РК КП(б)Б, ні гар. інспэктура ня цікавяцца становішчам настаўніка Кавалёнка.

### Зрабіць вывады

Вялікадзяржаўны расійскі шовінізм зьвіў сабе цёплае гнязьдзечка на Гомельскім вучастку і цягне масу вучнёўства, як школы ФЗВ, так і іншых школ, у шовіністычнае балота, а тым самым—да супраціўленьня беларусізацыі. Вучні, якія паступілі ў школу ФЗВ увесну, патрабавалі выкладаньня ўсіх прадметаў на беларускай мове, але „начальства" асвойвае вучнёўства з сваімі агіднымі адносінамі да правядзеньня беларусізацыі і ставіць крыж над ёю. Зараз набіраюць у школу яшчэ 600 вучняў, што з раней прынятымі складзе да 900 чалавек.

Нас цікавіць, як будзе навучацца амаль тысячная армія кадраў у школе ФЗВ, нас вельмі непакоіць і лёс настаўніка тав. Кавалёнка.

Вінаватыя ў цкаваньні яго павінны, нарэшце, быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці. Адпаведныя органы павінны безадкладна заняцца вывучэньнем стану школы ФЗВ, зьмяніўшы шовіністычнае кіраўніцтва яе, даць магчымасьць выхоўваць праўдзівыя пролетарскія, ідэолёгічна вытрыманыя і політычна - пісьменныя кадры.

**Віт. Сідарук.**

# Дырэктывы партыі павінны быць выкананы!

## ЛКСМБ абавязаны выканаць заданьне аб мобілізацыі ў пэдагогічныя ВНУ і тэхнікумы 1500 комсамольцаў

### Пастанова бюро ЦК КП(б)Б па пытаньню аб падрыхтоўцы да навучальнага году ад 29 жніўня 1930 г.

1. Заслухаўшы паведамленьне Наркамасьветы, ВСНГБ, НКЗему НКАховы Здароўя аб падрыхтоўцы да навучальнага году, Бюро ЦК КП(б)Б констатуе, што сучасны стан падрыхтоўкі да навучальнага году стварае пагрозу своечасоваму пачатку заняткаў.

Адзначана несвоечасовае забясьпечаньне навучальных установ кіруючымі і выкладчыцкімі кадрамі, адпаведным контынгентам студэнцтва, асабліва пэдустаноў і савбуду, незабясьпечаньне навучальных установ патрэбнай навучальнай і жыльлёвай плошчай адсутнасьць дастатковых мерапрыемстваў па організацыі харчаваньня студэнцтва.

2. Такі стан падрыхтоўкі да навучальнага году зьяўляецца, галоўным чынам, вынікам недаацэнкі задач па падрыхтоўцы кадраў, як з боку цэнтральных зацікаўленых установ, гэтак і адпаведных мясцовых Выканкомаў і Саветаў.

3. З боку ЦК ЛКСМБ ня было прынята належных мер да мобілізацыі комсамольцаў у Пэдінстытут, ня гледзячы на дадзеныя ЦК КП(б)Б дырэктывы.

4. Профэсыянальныя саюзы ў сваёй штодзеннай працы не ўдзялялі належнае ўвагі справе падрыхтоўкі кадраў, дзякуючы чаму сярод паступаючых у ВНУ не забясьпечана адпаведная колькасьць рабочых.

Бюро ЦК КП(б)Б констатуе, што з боку Культпропу ЦК справе кіраўніцтва разгортваньнем новага навучальнага году было ўдзелена мала ўвагі, да апошняга часу ня было прынята мер да сьцісьлай рэалізацыі перад Бюро ЦК КП(б)Б аб сапраўдным становішчы падрыхтоўкі да навучальнага году.

6. З боку БДВ ня было прынята дастатковых мер у галіне своечасовага забясьпечаньня сеткі народнае асьветы падручнікамі, навучальнымі прыладамі і асабліва програмамі.

7. Большасьць АК КП(б)Б і РК КП(б)Б ня выканалі дырэктывы ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да навучальнага году.

Бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Культпропу ЦК разам з Аддзелам Кадраў, у пяцідзённы тэрмін забясьпечыць кіруючымі кадрамі ВНУ і Тэхнікумы.

2. У мэтах забясьпечаньня пачатку навучальнага году, будаўніцтва і рамонт навучальных устаноў скончыць да вызначаных тэрмінаў. Пабудову інтэрнатаў скончыць да 1-га кастрычніка. Прапанаваць ВСНГБ Дзяржплану, Бел. Канторы Саюзлесу і будаўнічым організацыям пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў гэтых устаноў забясьпечыць будаўніцтва і рамонт навучальных устаноў і інтэрнатаў будаўнічымі матар'ямамі.

Наркампрацы цалкам забясьпечыць будаўніцтва рабсілай і лічыць гэтае будаўніцтва ўдарным.

3. Абавязаць ЦК ЛКСМБ выканаць заданьне аб мобілізацыі ў пэд. навучальныя ўстановы 1500 чал., ЦСПСБ разгарнуць працу па вярбоўцы ў ВНУ праз фабзаўкомы.

4. Прапанаваць фракцыі БКС у дэкадны тэрмін правесьці ўсе мерапрыемствы па організацыі харчаваньня студэнцтва.

5. Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных газэт штодзённа асьвятляць ход падрыхтоўкі да навучальнага году, узяўшы пад кантроль выкананьне пастаноў ЦК КП(б)Б і ЦКК і СНК па разгортваньню падрыхтоўкі да навучальнага году.

6. Прапанаваць БДВ не пазьней 15-IX—30 г. выдаць падручнікі для масавай школы, строга саблюдаючы пасьлядоўнасьць у выданьні падручнікаў першай неабходнасьці (чытанкі і інш.).

7. Прасіць ЦКК РСІ сыстэматычна правяраць работу ўсіх устаноў па падрыхтоўцы да навучальнага году, выкрываючы вінаватых у невыкананьні дырэктыў партыі і ўраду па разгортваньню навучальнага году і прыцягваць вінаватых да суровай адказнасьці,

КОМСАМОЛ БЕЛАРУСІ Ў КОЛГАСНА-ВЫТВОРЧЫМ ПАХОДЗЕ

# Да першага кастрычніка засілосаваць мільён тон

## Плян сілосаваньня выкананы ўсяго на 1,1 проц.

ШМАТ ЯКІЯ КОМСАМОЛЬСКІЯ ОРГАНІЗАЦЫІ ГАНЕБНА ПЛЯТУЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ, НЕДААЦЭНЬВАЮЦЬ ПАЛІТЫЧНАЙ ВАЖНАСЬЦІ ЗАДАЧ СІЛОСАВАНЬНЯ Ў ВЫРАШЭНЬНІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ ПРОБЛЕМЫ

ВЫКАРЫСТАЦЬ КОЖНЫ ЗАСТАЎШЫСЯ ДЗЕНЬ, КОЖНУЮ ГАДЗІНУ НА НАЙХУТЧЭЙШАЕ СКАНЧЭНЬНЕ БУДАЎНІЦТВА ЯМ І СТАНДАРТНЫХ БАКШТАЎ

**Праз кожныя дзесяць дзён інформуйце ЦК ЛКСМБ аб вашых конкрэтных заваёвах у выкананьні плянаў сілосаваньня**

**ПАСТАНОВА ПАРТЫІ ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА**

## Усе сілы на выкананьне важнейшай баявой палітычнай задачы

### Прыцягваць да суровай адказнасьці конкрэтных вінавайцаў зрыву пляну сілосаваньня

**Пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб сілосаваньн ад 29 жніўня 30 г.**

1. Ня гледзячы на тое, што сілосаваньне зьяўляецца важнейшым мерапрыемствам у справе вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы,—плян сілосаваньня ў сучасны момант выканан па БССР на 1,1 проц. з прычыны таго, што існуе фактычная недаацэнка важнасьці сілосаваньня. Асабліва недапушчальна тое, што савгасы плятуцца ў хвасьце па выкананьню пляну сілосаваньня.

2. Зямельныя і колгасна-коопэрацыйныя органы, профсаюзныя організацыі (асабліва саюз с.-г. і лясных рабочых і Працасьветы) партыйныя і комсамольскія організацыі, большасьць цэнтральных і акруговыя газэты не ўсьвядомілі важнасьці сілоснай кампаніі і па сапраўднаму не ўзяліся за яе правядзеньне. Толькі гэтым можна тлумачыць становішча, што стварылася ў справе сілосаваньня.

Засілосаваць адзін мілёен тон можна пры ўмове, калі будзе ўсімі організацыямі ўсьдомлена гаспадарча–палітычнае значэньне сілосаваньня, забясьпечаны ўдарныя тэмпы выкананьня плянаў і на гэту справу мобілізавана ўвага партыйных, профсаюзных, комсамольскіх, колгасна-коопэрацыйных організацый і шырокіх рабочых, колгасных мас і бедняцка-серадняцкага сялянства.

Бюро ЦК ставіць перад усімі партыйнымі, комсамольскімі, савецкімі, гаспадарчымі і коопэрацыйнымі організацыямі баявую за ачу вялічэзнай палітычнай важнасьці засілосаваць 1 мілёен тон да першага кастрычніка.

Прыцягваць да суровай партыйнай адказнасьці канкрэтных вінавайцаў зрыву пляну, шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва.

У дэкадны тэрмін правесьці сходы рабочых савгасаў, колгасьнікаў і бедняцка-серадняцкага сялянства, на якіх шырока растлумачыць значэньне сілосу, перагледзець пляны сілосаваньня ў бок іх павялічэньня.

3. Райкомам КП(б)Б, фракцыям РВК, прафсаюзных організацый і ўсім гаспадарчым органам, ад якіх залежыць правядзеньне сілоснай кампаніі вылучыць адказных працаўнікоў для выкананьня пляну.

ЦСПСБ прыняць усе захады да мобілізацыі профсаюзнай масы на гэту справу, асабліва саюзу Сельгаслесрабочых і Працасьветы.

Шырока скарыстаць аграномаў і ўсе культурныя сілы для дапамогі ў правядзеньні кампаніі па сілосаваньню.

4. Цэнтральным і акруговым газэтам штодзённа асьвятляць на старонках газэт ход кампаніі сілосаваньня.

5. Прапанаваць аддзелу кадраў на працягу 3 дзён вылучыць 5 комуністых для працы ў Колгасбудзе па сілосаваньню.

6. Даручыць Наркамзему забясьпечыць адпаведныя пункты сілосарэзкамі.

7. Даручыць т. Рачыцкаму праверыць як забясьпечана Колгасбудам зборка сілосных башань на мясцох

## „Адчапецеся вы з гэтым сілосам!“

### Чыю-ж функцыю захапіў РК КСМ? Адкажэце

**Калі комсамольская брыгада зьвярнулася ў Рычаўскі сельсавет (Тураўшчына) з просьбай дапамагчы пабудаваць сілосныя ямы, дык старшыня колгасу тав. ШРУБ заявіў: „Адчапецеся вы з гэтым сілосам, у мяне больш важнейшая праца ёсьць“. Старшыня Тураўскага колгасу „Новае жыцьцё“ не дазволіў зусім будаваць сілоснай ямы.**

**Некаторыя партыйныя і комсамольскія ячэйкі і сельсаветы не толькі ня ідуць насустрач гэтаму мерапрыемству, а наадварот, устаўляюць сьпіцы ў калёсы. Гэта наглядаецца ў вёсках Букшы, Та ож Рудзілавічы і г. д.**

**РК КСМ толькі заклаў 4 сілосныя ямы ў раёне і на гэтым спыніўся. Аграномы не мобілізаваны навакол гэтага мерапрыемства.**

**РК КСМ паставіў перад РК КП(б)Б пытаньне аб організацыі раённых курсаў па сілосаваньню, але чамусьці ў РК КП(б)Б пачалі высьмейваць гэтую прапанову: РК КСМ, моў, захапіў не свае функцыі. Дагэтуль яшчэ курсы не організаваны.**

**Селькор ЖУК.**

## Спужаліся лічбаў

Ячэйкі КСМ пры арцелі „Бязбожнік“, Лёзьнянскага раёну, Віцебскай акругі, нічога не зрабілі па сілосаваньню кармоў. Арцелі „Бязбожнік“ дана заданьне засілосаваць 9 000 пудоў корму. Арцельшчыкі спалохаліся гэтае лічбы і катэгорычна заяўляюць:

— Мы заданьне выканаць ня можам, бо ў нашай арцелі не дахапае рабочай сілы ня толькі для сілосаваньня, а нават і для уборкі ўраджаю.

Ячэйка комсамолу прымірэнча аднеслася да гэтай заявы. Лёзьнянскі РК ЛКСМБ склаў брыгаду з местачковых комсамольцаў у ліку 10 чалавек і накіраваў яе ў комсамольскую ячэйку колгасу „Бязбожнік“ для практычнай дапамогі па сілосаваньню кармоў.

Комсамольская-ж ячэйка зусім нядбайна аднеслася да прысланай брыгады. Брыгада тры гадзіны стаяла бяз працы, бо не падрыхтавалі рыдлёвак. Нарэшце ўзяліся за працу. Выкапалі яму ў адзін мэтр глыбінёю. Вечарком брыгада, ня еўшы, пашла дамоў. На адбыўшымся сходзе комсамольскай ячэйкі, дзе ўпяршыню стаяла пытаньне аб сілосаваньні, комсамольская ячэйка абяцае ўзяць практычнае шэфства над сілоснымі ямамі.

Ня лепш працуюць па сілосаваньню комсамольскія ячэйкі і ў колгасах „Адказ ворагам“, „Бальшавік“, „Чырвоны Араты“, „Інтэрнацыянал“, „Першае мая“.

**Кароль.**

## Адмаўляюцца дапамагчы

Самахвалаўская местачковая ячэйка ЛКСМБ даўно абгаварвала пытаньне сілосаваньня, але практычнага нічога не зрабіла. Праўленьне колгасу „Ленінскі Шлях“ зусім адмаўляецца аказаць якую-небудзь дапамогу ў будаўніцтве сілосных ям.

Комсамольская ячэйка некалькі раз ужо зьбіралася капаць яму,— але праўленьне не дае месца для капаньня.

**Комсамолец М.**

Пошта-тэлеграма

## Усім РК ЛКСМБ

### Пляны сілосаваньня па Беларусі зрываюцца

На 20-е жніўнае заданьне па сілосаваньню выканана ўсяго на 1,1 проц.

Тэмпы працы па сілосаваньню недапушчальныя. ЦК прапануе час, які застаўся скарыстаць для найхутчэйшага сканчэньня будаўніцтва ям і стандартных бакштаў.

Зьвярнеце сур'ёзьнейшую ўвагу на якасьць будаўніцтва і сілосаваньне.

ЦК прапануе разгарнуць самыя баявыя тэмпы працы, мобілізаваўшы вакол гэтага ўвагу ўсяе грамадзкасьці.

Праз кожныя 10 дзён інформуйце ЦК аб выкананьні пляну сілосаваньня.

**Сэкратар ЦК ЛКСМБ М. ПАЛЯКОЎ.**

## „Цыркуляры разасланы, праца ідзе“(!?)

Будаўніцтва сілосных ям па Мазырскай акрузе ідзе недапушчальна маруднымі тэмпамі. Заданьні па будаўніцтву сілосных ям і загатоўцы сілоснай масы ва ўсіх раёнах ня выкананы.

Організаваныя курсы АК ЛКСМБ у большасьці раёнаў распаліся.

Ганебна адстаюць Жыткавіцкі і Азарыцкі раёны. Адчуваецца вялікі недахоп у будаўнічых матар'ялах: цьвікох, цэманце і інш.

А на станцыі (Калінкавічы) ляжаць некранутыя бочкі цэманту і нічога ня ўжыта, каб перавесьці будаўніцтва сілосных ям на мясцовы будаўнічы матар'ял.

У Капаткевічкім раёне комсамольцы нічога ня робяць па сілосаваньню кармоў і капаньню ям. Прыехаўшыя на вакацыі студэнты, як напрыклад т. т. Бэрнацкі і Шэрман (вёскі Некрашы), выступілі супроць суботніка па сілосаваньню, заяўляючы: „комсамольцы не батракі і ям капаць ня будзем“.

Комсамольскія брыгады, якія організоўваюцца ячэйкамі і райкомам комсамолу, на мясцох сустракаюцца вельмі дрэнна. У Тураўскім раёне прышла адна брыгада ў колгас і папрасіла даць работу па будаўніцтву сілоснай ямы, дык старшыня колгасу адказаў: „у мяне няма чаго рабіць“.

Старшыня колгассаюзу (Жыткавіцкі раён) сказаў так брыгадзе комсамольцаў, якая прышла абсьледваць ход сілоснага будаўніцтва па раёну: „Цыркуляры разасланы, праца ідзе!“ А між тым, гэты раён ганебна пляцецца ў хвасьце

Душыцца ініцыятыва комсамольцаў. Аднойчы, калі прышлі брыгады комсамольцаў будаваць ямы, райаграном знарок кудысьці выехаў, з адной мэтай уцячы ад будаўніцтва сілосу.

Ня гледзячы на ўсе перашкоды, брыгады АК Комсамолу (Калінкавіцкі раён) пабудавалі ўжо каля 35 ям, зрабілі налёт на станцыю, дзе знайшлі нявыкарыстаныя бочкі цэманту.

**Брыгадзір „Б. В“. Бітук.**




„З прыемным апэтытам“—але жывёлу ты гэтым не накорміш.

## Два разы абгаварылі, а яшчэ нічога не зрабілі!

Комсамольская ячэйка Хутарскога сельсавету ўжо два разы абгаварвала пытаньне аб пабудове сілосных ям у колгасе „Комунар“, але практычнае працы яшчэ не пачынала. Калі старшыні колгасу тав. **Парэцку** сказалі, што трэба пачаць будаваць яму для сілосу, дык ён адказаў: **„Навошта нам гэты сілос, калі ў колгасе корму на зімку не хапае“.**

Па сельсавеце не засеяна 15 проц. яравога кліну. Колгас „Комунар“ не засеяў свой вучастак зямлі на 100 проц. А гэта магчыма было-б зрабіць, калі-б партыйная, комсамольская ячэйкі і актыў сельсавету праявілі мінімум увагі.

**М. Ракіта.**

## —„Яма—ня воўк і ў лес не ўцячэ“!..

Глуская комсамольская організацыя яшчэ два тыдні таму назад пастанавіла выкапаць у колгасе „Рэв. выбух“ адну сілосную яму на 6000 пудоў сілоснае масы. З таго часу прайшло ўжо два тыдні і практычнага яшчэ нічога ня зроблена. Комсамольцы абедзьвюх ячэек, за выключэньнем 20-25 чалавек з агульнай колькасьці 96 чалавек, ганебна бязьдзейнічаюць.

З боку парторганізацыі няма ніякай дапамогі і кіраўніцтва. Вось, напрыклад, комсамолец - партыец тав. **Глезэр**, былы сэкратар ячэйкі, якога за бязьдзейнасьць зьнялі з работы, спацыруючы падышоў паглядзець як комсамольцы капаюць яму. Калі яго папрасілі дапамагчы капаць яму, дык ён адказаў: **„Яма—ня воўк і ў лес не ўцячэ“** Комсамольцы Марголін Х. і інш. заяўляюць на агульным сходзе, што яны лепш дадуць 50 кап. ці рубля, чымся пойдуць капаць яму.

**Шмель.**

## Праслухалі інформацыю і... кропка

У Горкаўскім сельсавеце налічваецца 6 колгасаў; яны і да гэтага часу не пабудавалі ніводнай сілоснай ямы. **Ніякай працы ў гэтым напрамку не праводзіцца, акрамя заслуханьня некалькіх інформацый.**

Партыйная і комсамольская ячэйкі чакаюць цыркуляраў з райкому.

Атрад „лёгкай кавалерыі“ нічога ня робіць па выяўленьню безадказьнейшых адносін да будаўніцтва сілосных ям.

**Л. К.**

## „Згадзіліся“ закласьці адну яму!..

Бялыніцкая комсамольская організацыя сваечасова падхапіла і абгаварыла пытаньні сілосаваньня. Затое раённыя установы на гэта не адгукнуліся. Калі пры РК ЛКСМБ організавалася брыгада з местачковага актыву і прыступіла да капаньня сілосных ям, дык 15 колгасаў зусім не далі рабочай сілы.

Колгас **м. Бялыніч, „Чырвоны Змагар“** зьняў нават з работы комсамольцаў. Колгас „Леніна“ толькі ў апошні час згадзіўся закласьці адну сілосную яму.

Адчыніліся раённыя курсы па сілосаваньню. Іх наведвалі толькі комсамольцы і частка беспартыйнай моладзі, а восем колгасаў ня далі ніводнага прадстаўніка. Райколгассаюз абмежаваўся толькі вынясеньнем пастановы аб гэтых курсах.

**І. С. Бядуленка.**

„Пяцігодка ў чатыры гады“

# Давядзем пазыку да кожнага працоўнага

**Шмат якія райкомы ЛКСМБ і сельсаветы недапушчальна адносяцца да рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка ў чатыры гады“, не вядуць растлумачальнай работы**

**Шляхам соцыялістычнага спаборніцтва ячэйкі з ячэйкай, раёну з раёнам,— даб'емся стопроцантнай рэалізацыі пазыкі сярод працоўнага насельніцтва вёскі**

## „...Адчапецеся,—у мяне няма часу!“

„Ч. З.“ ужо пісала, што рэалізацыя пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“ па Заслаўскім раёне праходзіць марудна. Такое прыкладна становішча і на сёньнешні дзень.

Праўда, у некаторых мясцох за гэтую працу ўжо ўзяліся. Напрыклад, працаўнікі Заслаўскага лясьніцтва падпісаліся на пазыку ў разьмеры месячнага акладу пэнсіі, што складае 1165 руб. і выклікаюць Лагойскае, Гаінскае і Менскае лясьніцтва. Таксама комсамольскія ячэйкі, як Заслаўская мястэчковая і ячэйка колгасу „Чырвоная Зорка“ ухвалілі падпісацца ўсім комсамольцам у разьмеры месячнага заработку, комсамольцам гэтых ячэек правесьці растлумачальн. працу аб пазыцы па колгасах і па вёсцы. У выніку гэтага пазыка добра распаўсюджваецца сярод насельніцтва.

Але побач з гэтым, шмат дзе аб пазыцы „Пяцігодка—у чатыры гады“ зусім ня ведаюць. Асабліва ў гэтай справе адстаюць саўгасы раёну. У саўгасах Саламарэчча і Сялец і іншых, рабочыя зусім не знаёмы з тым, як праходзіць падпіска на пазыку. Рабачкомы нічога ня робяць па распаўсюджваньню і популярызацыі новай пазыкі сярод рабочых. Калі запытаеш у старшыні рабачкому саўгасу Саламарэчча т. Яноўскага аб пазыцы, дык ён, разам хваючы рукамі, адказвае:—„Дайце ўбраць ураджай, адчапецеся з пазыкай,—у мяне няма часу“.

РК ЛКСМ яшчэ недастаткова правярае працу ячэек па распаўсюджваньню пазыкі. У індывідуальным сэктары яшчэ і сёньня па ўсіх сельсаветах цішыня ў гэтай працы. Сельсаветы ўсё чакаюць пакуль дырэктывы з РВК, якую РВК усё яшчэ не прысылае.

Трэба ўсім організацыям Заслаўшчыны па-баявому ўзяцца за гэтую працу. Комсамольск. ячэйкі саўгасаў і сельсаветаў павінны быць наперадзе.

**А. Верас.**

## Ні гу-гу...

Рэчыцкая і Халоблінская ячэйкі ЛКСМ (Чэрыкаўшчына, Магілеўская акруга) не вядуць ніякай працы па рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“. Комсамольцы гэтых ячэек ня толькі не праводзяць працы па рэалізацыі пазыкі сярод сялянства, але і самі яшчэ ня ўсе ведаюць пра яе і да гэтага часу не падпісаліся.

**АУР.**

## Толькі на 65 руб...

Партыйная і комсамольская організацыі Тураўшчыны (Мазырская акруга) на сёньнешні дзень яшчэ не мобілізавалі масу на вырашэньне задачы рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“. Напрыклад, па ўсім Азяранскім сельсавеце падпіска дасягнула 65 руб. і то толькі сярод колгасьнікаў.

А сярод адзінаасобнікаў бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі абсалютна нічога не праводзіцца.

**Навальніца.**

## 3 тыс. пуд. хлеба дзяржаве

**ПЛЕШЧАНІЦЫ, 29. (Па тэл.ад нашага юнкора). 26 жніўня ў мястэчка Плешчаніцы прыбыў чырвоны абоз, у якім прынялі ўдзел 400 падвод індывідуальнікаў. Здадзена 3 тыс. пудоў хлеба.**

**ГЭЛЬФМАН.**

## Праводзяць работу здавальняюча

Дудзіцкая комсамольская ячэйка (Самахвалаўшчына) на сваім агульным сходзе пастанавіла падпісацца на двухтыднёвы заработак усіх комсамольцаў і выклікала колгас імя Комвузу Беларусі пасьледваць яе прыкладу. Колгас падпісаўся на 500 руб. Вылучаны комсамольцы ў дапамогу сельсаветам у правядзеньні падпіскі сярод колгасьнікаў.

**Чаборык.**

* * *

Матароўская ячэйка ЛКСМ пачала працу па рэалізацыі новай пазыкі. Гэта пытаньне было абгаворана на сходзе ячэйкі, дзе ўхвалілі кожнаму комсамольцу падпісацца ня менш, чымся на 10 руб., што і зроблена. Ячэйка ў цэлым падпісалася на 150 руб.

Кантрольную лічбу РК ЛКСМ мы перавыканалі.

**П. Крывіца.**

* * *

Падпіска на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“ у часьцях №-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі абярнулася ў буйную палітычную кампанію. Падпіска на пазыку праходзіла пад лёзунгам 100 проц. ахопу ёю ўсіх байцоў і начскладу.

На 23 жніўня сума падпіскі раўнялася 69500 руб. Гэтая сума ўжо перавысіла лічбу падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі, што кажа аб выкананьні ў асноўным кантрольных лічбаў падпіскі.

З усіх часьцей найбольшую суму далі Стаўрапальцы, якія падпісаліся на 11550 руб.

Процантам ахопу можа ганарыцца №-і эскадрон, дзе на пазыку падпісаліся ўсе байцы і камандзіры эскадрону, за выключэньнем тых, якія ідуць у доўга-тэрміновы адпачынак.

Падпіска на пазыку працягваецца.

**Г. Шыфрын.**

* * *

Рыбгаская ячэйка ЛКСМ (Мазыршчына), прачытаўшы ў „Чырвонай Зьмене“ ад 19 жніўня 1930 г. выклік на падпісцы на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“, сумесна з рабочымі саўгасу падпісалася на 2000 руб. і выклікае на соцспаборніцтва Дарашэвіцкі саўгас, Петрыкоўскага раёну.

**Каплан Арон**

## Новы выпуск 113 пэдагогаў

29-га жніўня ў залі Менскага Гарсавету адбыўся ўрачысты вечар, прысьвечаны датэрміноваму выпуску трэцяга курсу беларускага, яўрэйскага і польскага пэдагогічных тэхнікумаў.

Вечар адчыніў намесьнік дырэктара Белпэдтэхнікуму тав. Багдановіч, які ў сваёй кароценькай прамове адзначыў тую вялікую ролю, у сувязі з ўсеагульным пачатковым навучаньнем, якая зараз ускладаецца партыяй на настаўніцкім кадры.

Усяго выпускаецца 113 новых пэдагогаў, добра падкаваных марксысцка-ленінскімі ведамі. Яны змогуць у сапраўды комуністычным духу выхоўваць вучняў—дзяцей працоўнага сялянства вёскі.

Белпэдтэхнікум выпусьціў—49 чалавек, яўпэдтэхнікум—39 чалавек і польпэдтэхнікум—25 чал.

Выпускнікоў горача віталі прадстаўнік Наркамасьветы, прадстаўнікі партыйных і комсамольскіх організацый усіх трох тэхнікумаў.

Прывітальныя тэлеграмы былі атрыманы ад прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук тав. Ігнатоўскага, які шчыра вітае выпускнікоў і жадае вялікіх посьпехаў у справе марксысцка-ленінскага пэдагогічнага выхаваньня маладога пакаленьня.

Вечар скончыўся даволі добрым канцэртам Маскоўскай Сіняй Блюзы.

**А. А—й.**

## Галавацяпаў трэба прыцягнуць да адказнасьці

Пры Белкоопсаюзе летась былі організаваны курсы — ФЗВ кулінараў.

На гэтыя курсы з раёну прыехала 6 чалавек вучняў, якім па дагавору памяшканьне і стыпэндыю павінен даваць БКС.

З стыпэндыяй справа так-сяк наладжана, але памяшканьня вучні ня маюць.

Зараз гэты ФЗВ перайшоў пад ведама МЦРК, і БКС выганяе з свайго памяшканьня гэтых 6 вучняў, а ЦРК для іх таксама памяшканьня даць ня зьбіраецца.

Так з-за галавацяпства БКС і МЦРК шасьці фабзайцам пагражае вуліца.

Належныя організацыі павінны тэрмінова заняцца гэтым пытаньнем і прыцягнуць галавацяпаў да адказнасьці.

**„Кавалерысты“.**

## „Чырвоная Зьмена“ дапамагла

**Чэрвеньскі РК ЛКСМБ** паведамляе, што факты, аб якіх пісалася ў нататцы: „Лікпункт не працуе“ падцьвердзіліся. **Манкевіч**, па віне якога перастаў працаваць лікпункт, пастановай РК ЛКСМБ **зьняты з працы.**

**Сакратар Бярэзінскага РК КП(б)Б** паведамляе, што факты заметкі: „Ці-ж гэта жыцьцё“ падцьвердзіліся. РВК прапанавала Каменна-Бароўскаму сельсавету правесьці ў жыцьцё пастанову суда.

**Старшыня вучкому Аршанскай профтэхшколы** паведамляе, што нататка „Твар антысэміта“ адпавядае сапраўднасьці. **Антысэміт Баранаў выключан са школы.**

**Бюро скаргаў пры Мазырскай А...** РСІ паведамляе, што нататка — „Д... тар—сакратар“ падцьвердзілася. ... **ман, аб якім пісалася ў гэтай нат... цы, вынесьлі суровую вымову.**

Дасланая на расьсьледваньне нат... ка: „Хто ліквідуе няпісьменнасьць“ падцьвердзілася. **Рэмез выключан з колгасу і зьняты з працы па ліквідацыі няпісьменнасьці.**

Па нататцы, зьмешчанай у „Ч. З.“ ад 31 студзеня 1930 г., аб **Нічэпар Мікалаю** прыняты належныя заха... **Нічэпар Мікалай, як сын кулака, выключан з ліку курсантаў і дакументы яго накіраваны ў Менскую пракуратуру, таму што ў анкеце напісана ... цам Нічэпар—бядняк.**

## Паштовая скрынка

**Протчанку**—„Растлумачым бацьком“, **В. У.**—„Дапаможам колгасу“. **Лявіцкаму**—„Кандылаўшчына сьпіць“, „Працуюць па-ударнаму“, „Уборка ярыны праходзіць пасьпяхова“, **„Падлецкаму Ал.**—„Бабруйская акруга“, **Сурко**—„Комсамол на дапамогу колгасам“, **Міфко**—„Колгас Авангард“ **Янпаўцу К.**—„Там, дзе пастаўлена добра праца“, **Шванкову**—„Колгасы скончылі ўборку азімага“, **Брыгадзіру Рэчыцнаму**—„Колгасы Рэчыцы рапартуюць“, **Чубару**—„Працавалі па-ўдарнаму“, **Собалю**—„Уборка жыта праводзіцца ўдарным парадкам“, **Малатку Р.**—„Лішкі хлеба-дзяржаве“, **Майсеенку**—„Уборку азімага скончылі“, **Аро...**—„Сьпяць спакойным сном“, **Абгі...** **кавалерысту**—„Гні жыта“, **Рубін...**—„Бальшавіцкая ўборка—у са... разгары“, **Шурману**—„Больш субботнікаў“, **Груздову**—„Жура... раён, арцель „Дружба“**, **Івановічу**—„Старшыня колгасу—куліган“, **Еф...**—„Там, дзе комсамольцы на колг... ным фронце“, **Сваймy**—„Ня мо... крытыкаваць“, **Верасу**—„Саўгасы ... туцца ў хвасьце“, „Прыступілі ... жніва аўсу“, „Жніво жыта скончы...“

Пералічаныя допісы зьмешчаны ... будуць, бо частка гэтых фактаў у... друкавалася, астатнія—дробязь.

## Паведамленьні

— Сёньня, а 5-ай гадз. увечары адбудзецца пасяджэньне бюро Фрунзэўскага РК ЛКСМБ. Яўка ўсіх сяброў і кандыдатаў абавязкова.

— Фрунзэўскі РК ЛКСМБ склікае на 2-ое жніўня, а 8-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу Саўгандл... служачых аб'яднанае пасяджэньне бюро ячэек савецкіх устаноў сумесна з бюро юнсэкцыі клюбу па пытаньнях клюбнай работы і падрыхтоўкі МЮД'у. Яўка абавязкова.

**Адказны рэдактар—Рэдколегія**










Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599